http://edoc.bseu.by

***М. Д. Свідзерскі***
*Навуковы кіраўнік — Г. М. Тачко*
*БДЭУ (Мінск)*

# ПРАМЫСЛОВАСЦЬ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ПЕРСПЕКТЫВЫ І КІРУНКІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ

Прамысловасць — гэта сукупнасць відаў эканамічнай дзейнасці ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, звязаных з вытворчасцю прылад, энэргіі і спажывецкіх тавараў, здабычай сыравіны, матэрыялаў, паліва і далейшай перапрацоўкай прадуктаў, атрыманых у прамысловасці або выробленых у сельскай гаспадарцы.

Дзяржаўнае рэгуляванне па комплексах прамысловасці ў Беларусі ажыццяўляюць 8 суб’ектаў. Да іх датычацца Міністэрствы прамысловасці, энэргетыкі, аховы здароўя і эканомікі, а таксама дзяржаўныя канцэрны. Для ўзгаднення дзяржаўнай прамысловай палітыкі была ўтворана Камісія па пытаннях прамысловай палітыкі. Такая колькасць суб’ектаў не стымулюе правядзенне цэльнай палітыкі, а таксама ўтварае перагрузку ў дзяржаўным апараце. Напрыклад, у суседніх краінах прамысловай палітыкай займаюцца 1–2 ведамствы.

Асноўнай праблемай, якая ўтрымлівае развіццё прамысловасці, варта назваць перавышэнне тэмпаў росту заработнай платы над тэмпамі росту прадукцыйнасці працы. У 2020 г. тэмпы росту першай перавышалі на 14,4 % [1, с. 10]. Гэта сведчыць аб тым, што прадпрыемствы, якія складаюць асноўную долю аб’ёму выпуску, знаходзяцца пад кантролем дзяржавы і выконваюць сацыяльную функцыю.

Для развіцця прамысловасці дзяржава рэалізавала дзве праграмы, якія былі накіраваны на машынабудаўнічы і фармацэўтычны комплексы. На прыкладзе Праграмы развіцця фармацэўтычнай прамысловасці, якая рэалізоўвалася з 2016-га па 2020 г., можна адзначыць, што эфектыўнасць выканання праграм знаходзіцца на невысокім узроўні. Няпоўнае выкананне было звязана з тым, што ўлады не здолелі заахвоціць прыватныя кампаніі выходзіць на знешнія рынкі і нарошчваць аб’ёмы выпуску, а таксама з нізкай дыферэнцыяцыяй экспарту. Таксама пры выкананні дадзенай праграмы адбылося перавышэнне запланаванага фінансавання, што пацверджвае неэфектыўнасць выканання гэтай дзяржаўнай праграмы.

Такім чынам, можна вылучыць наступныя праблемы беларускай прамысловасці: занадта вялікая колькасць суб’ектаў дзяржаўнага рэгулявання; адсутнасць нарматыўнай базы і праграм па развіццю прамысловасці, што ўскладняе прыняцце мер па развіццю комплексу; кантроль дзяржаўнымі органамі флагманскіх прадпрыемстваў, што не стварае стымулаў да ўкаранення ўскосных метадаў дзяржаўнага рэгулявання і дае дзяржаве магчымасць выкарыстоўваць прадпрыемствы як інструмент сацыяльнай палітыкі; нізкая дыферэнцыяцыя экспарту, што выклікае залежнасць ад эканамічнага стану экспартапрымальніка.

Зыходзячы з апісаных вышэй недахопаў, корнем усіх праблем у прамысловай сферы з’яўляецца сістэма дзяржаўнага кіравання прамысловасцю. Яна мае вялікі шэраг праблем і патрабуе істотных змен у арганізацыі рэгулявання і распрацовак

у нарматыўна-прававой базе. Пры адсутнасці ў бліжэйшым часе рэформ у дзяржаўным рэгуляванні прамысловай сферай беларуская індустрыя будзе губляць рынкі збыту сваёй прадукцыі, што негатыўна адаб'ецца на эканамічным стане краіны.

**Крыніца**

1. Промышленность Республики Беларусь, 2021: статистический буклет [Электронный ресурс] // Национальный статистический комитет Республики Беларусь. — Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/186/dhmhgom8 o81ci85jmnwfenebwj5j01gi.pdf. — Дата доступа: 11.04.2022.